**Войшік С.Ф.,**
*ст.выкладчык*

# АВАЛОДАННЕ НАВЫКАМІ ДЫРЫЖЫРАВАННЯ НЕСІМЕТРЫЧНЫХ ПАМЕРАЎ (на прыкладах харавых твораў)

Дырыжор, як і любы музыкант-выканаўца, не толькі павінен глыбока адчуваць, любіць музыку, але і разумець, якімі сродкамі ён зможа раскрыць мастацкую задуму музычнага твора.

Выканаўца твора дасягае сваёй мэты толькі тады, калі да канца раскрываецца выразная сіла ўсіх яго элементаў: мелодыі, гармоніі, тэмпу, дынамікі, метрарытму.

У працэсе навучання студэнт сустракаецца не толькі з добра знаёмымі простымі памерамі, але і са складанымі, якія ў сваю чаргу складаюцца з некалькі простых. Несіметрычныя памеры — неадʼемная якасць рускай, беларускай нацыянальнай музыкі, традыцыі якой бліскуча адлюстроўваюць творы класікаў, сучасных кампазітараў. Уключэнне ў вучэбныя планы гэтых твораў не толькі знаёміць студэнта з лепшымі ўзорамі нацыянальнага мастацтва, але і зʼяўляецца сродкам выхавання дырыжорскай тэхнікі.

Вывучэнне несіметрычных памераў пачынаецца на трэцім курсе з пяцідольнага. Гэты памер складаецца з двух простых: двух- і трохдольнага. Паслядоўнасць іх ў творах можа мяняцца. Дырыжору важна вызначыць групоўку (2+3), (3+2) і спосабы дырыжыравання. Іх два.

Першы спосаб ужываецца, галоўным чынам, тады, калі даводзіцца мець справу з сярэднімі і павольнымі тэмпамі. На кожную долю прыпадае дырыжорскі жэст, а ўсяго ў такце — пяць.

Групоўка 2+3. Першая доля накіроўваецца ўніз, другая мяккім рухам у сярэдзіну, трэцяя адкладваецца выразным жэстам ад сябе, чацвертая — слабейшая, выконваецца ў тым жа напрамку, што і трэцяя, пятая ўверх.

Групоўка 3+2. Першая доля накіроўваецца ўніз, другая — уніз (яна займае ўсяго палову першай), трэцяя — у сярэдзіну, чацвёртая ў процілеглы бок, пятая — уверх.

Другі спосаб ужываецца, калі хуткасць тэмпу не дазваляе вызначыць кожную метрычную долю такта асобным жэстам і вымушае абʼядноўваць некалькі метрычных доляй ў адну лічыльную долю. Паколькі складаны несіметрычны такт налічвае два простых 2/4 і 3/4 ці 3/4 і 2/4, адна доля будзе больш падоўжаная. Яе трэба паказваць ярчэй, быццам бы акцэнтуючы жэстам, «чапляючым» знізу ўверх і ўперад. Студэнтам можна прапанаваць у пяцідольным памеры наступныя складаныя творы .

Групоўка 2+3: Чайкоўскі П. Опера «Чарадзейка» , хор «Нам не дорага піва хмельнае»; Буцько. Ю. «Каля перама»; апрацоўка беларускай народнай песні Паплаўскага К. «Закаці, закаці, яснае сонейка».

Групоўка 3+2: Даргамыжскі А. Опера «Рагдана», хор «Як дзяніца зʼявіцца»; Чайкоўскі П. Опера «Чаравічкі», хор русалак «Цёмна нам, цёмна».

Пры дырыжыраванні пяцідольнага памеру «на два» з групоўкай 2+3 на першы жэст выпадае дзве долі, на другі — тры.

Прыклады харавых твораў:Пракофʼеў С. Опера «Любоў да трох апельсінаў», хор медыкаў; Холмінаў А. Опера «Аптымістычная трагедыя», хор анархістаў з першага акта; Глінка М. Опера «Руслан і Людміла», хор «Лель таямнічы»; літоўская народная песня ў апрацоўцы Вендкуса В. «Ой ты, мой дубочак».

Групоўка 3+2, дзе першы жэст больш падоўжаны за другі і ўключае тры долі, сустракаецца ў народных творах: Галынін Г. Араторыя «Дзяўчына і смерць», ч.4.; Эманаў А. Хор «Праляталі гусі-лебедзі»; Аруцюнян А. Кантата «Радзіма», частка «Свята працы»; Стравінскі І. «Айцец наш».

Існуюць харавыя творы, дзе ўжываюцца ў адных тактах групоўка 3+2,у другіх 2+3. Напрыклад: Ленскі А.»То ляцелі гусі»; Парцхаладзе М. «Восенню».

Пасля пяцідольнага памеру вывучаецца семідольны памер.Складаецца ён з трох - і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чатырохдольнага. Існуюць два спосабы дырыжыравання. Першы ўжываецца пры павольных тэмпах. У аснове такціравання ляжыць чатырохдольная схема, дзе пры групоўцы 3 + 4 падвойваюцца першая, трэцяя і чацвёртая долі, а пры групоўцы 4+3 падвойваюцца першая, другая і трэцяя долі.

Такім чынам, у такце сем дырыжорскіх долей. Прывядзем прыклады харавых твораў. Групоўка 3+4: беларуская народная песня ў апрацоўцы Сіраты М. «Балада пра партызанку Галіну»; Сняткоў Б. «Вячэрняя песня»; Рымскі-Корсакаў М. Опера «Казка пра цара Салтана», хор «Што так рана, сонца чырвонае»; літоўская народная песня ў апрацоўцы Юр'яна А. «Вырасла я за ракой».

Групоўка 4+3: Сяроў А. Опера «Рагнеда», хор «У цёмным лесе звер жыве»; руская народная песня ў апрацоўцы Баранава Б. «Ой ты, Волга, Волга -рэчанька»; руская народная песня ў апрацоўцы Папова С. «Ужо вы, ветры мае, вецярочкі»; беларуская народная песня ў апрацоўцы Наско Э. «Ой, пайду я на даліну»; Барадзін А. «Песня цёмнага лесу» (сустракаюцца такты з групоўкай 3+4).

Творы ў хуткіх тэмпах дырыжыруюць па трохдольнай схеме. Любая з долей можа быць падоўжаная. Цікавымі прыкладамі з'яўляюцца наступныя творы: Хрыстаў Д. «Ручаніца» (групоўка 2+2+3); руская народная песня ў апрацоўцы Баранава Б. «Ой, калінушка» (групоўка 2+3+2); Данілаў Ул. «Завіруха» (групоўкі 2+3+2, 3+2+2, 2+2+3).

Існуюць асобныя выпадкі ў харавой літаратуры, дзе ў творах, якія напісаны ў складаных сіметрычных памерах, сустракаюцца такты, дзе долі несіметрычныя. Хрэстаматыйны прыклад — гэта хор М. Рымскага-Корсакава «Ой, бяда ідзе, людзі»з оперы «Сказ пра нябачны горад Кіцеж». Памер 9/8. Разам з тактамі, дзе групоўка 3+3+3, сустракаюцца наступныя: 2+2+2+3 і 2+3+2+2. Несіметрычныя долі сустракаюцца ў апрацоўцы ўкраінскай народнай песні «Круты бераг» Ф. Казіцкага. Памер 8/8 трэба дырыжыраваць па трохдольнай схеме з групоўкай 2+3+2, у апрацоўцы Ул. Сіміча македонскай народнай песні «Ішла дзяўчына па валу» памер 9/8 дырыжыраваць трэба па чатырохдольнай схеме з групоўкай 2+2+3+2. У апрацоўцы Баранава Б. беларускай народнай песні «Рэчанька» памер 9/8 дырыжыраваць трэба па чатырохдольнай схеме з групоўкай 2+2+3+2.

Цікавым прыкладам з'яўляецца хор «Праз тры дні на вячэрняй зары» з оперы «Млада» М. Рымскага-Корсакава. Памер 8/8 трэба дырыжыраваць па трохдольнай схеме з групоўкай 3+3+2.

У працэсе работы над творамі, якія напісаны ў несіметрычных памерах, студэнт можа сустрэцца з некаторымі цяжкасцямі.

Памер ці метр, якія выстаўлены ў пачатку твора, не заўсёды азначаюць схему такціравання. Ёсць некалькі спосабаў, пры дапамозе якіх кампазітар указвае на структуру такціравання.

1. Структура такта можа быць абазначана ў пачатку твора нотнымі знакамі-формуламі, якія паказваюць на паслядоўнасць долей. Такія формулы выстаўляюцца радам з абазначэннем тэмпу і метранома:  і г.д. Калі структура такта мяняецца, кампазітар выстаўляе новыя ўказанні.

Напрыклад: 

2. Іншы раз аўтар нотнага тэксту абазначае структуру такта пры дапамозе пункцірных ліній, якія ўмоўна дзеляць такт, і па іх можна выявіць схему такціравання.

3. Надзейны паказчык метрычнай структуры такта — літаратурны тэкст. Напрыклад: хор Аракішвілі Д. «Пра паэта», памер 8/8 сіметрычны, але тэкст «ветер рыдает в ущельях» дыктуе наступную групоўку:



"светлого смерть похитила"



4. Паказчыкам метрычнай структуры такта могуць служыць лігі:




5.Іншы раз лігі адсутнічаюць. Тады крытэрыем можа стаць запіс вытрыманай гармоніі. Менавіта яна пакажа групоўку дэталей.

Пры дырыжыраванні несіметрычных памераў у тактах з няроўнымі па даўжыні долямі трэба звярнуць ўвагу на тэхніку выка-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

нання. Існуе два спосабы. Першы. У мэтах захавання рытму неабходна памятаць аб тым, што даўжэйшая доля выконваецца не за кошт павольнасці тэмпу, а за кошт павелічэння амплітуды.

Другі. Даўжэйшая па часу доля выконваецца не за кошт павелічэння амплітуды, а за кошт прыпынку рукі. Ен робіцца ў ніжнім пункце большай долі. Калі-нікалі прыпынак замяняецца дадатковым рухам рукі ў бок ў выглядзе пятлі ці зігзагу і тым самым робіць долю даўжэйшай па часе.

Пры авалоданні навыкамі дырыжыравання несіметрычных долей карысна вымаўляць словы: раз, два-тры , чатыры , пяць або розныя словазлучэнні, напрыклад: дум-ба/ дум-ба-ра. Гэтыя практыкаванні выконваць у розных варыянтах і схемах, спачатку ў павольным, а потым у хуткім тэмпе.

XX стагоддзе — час вялікіх змен у музыцы. У творчасці сучасных кампазітараў рысы новага перапляліся з народнай творчасцю, лепшымі традыцыямі кампазітараў-класікаў. У галіне харавога жанру напісана многа твораў, у якіх сустракаюцца несіметрычныя памеры. Яны могуць быць цікавымі і карыснымі для студэнтаў дырыжорска-харавой спецыялізацыі. Напрыклад: Ленскі А. Опера «Якаў Шыбалок», хор станічнікаў; Шастаковіч Д. «Пакаранне смерцю Сцяпана Разіна»; Бойка Р. «Валагодскія карункі»; Тамбер Э. «Родная зямля».

Цікавыя і апрацоўкі народных песень, якія зроблены рускімі і беларускімі кампазітарамі:

Салманаў Ул. «Бела-румяна»; Калоўскі А. «На гарушцы, на гары»; Турышаў А. «Румяна поле» і інш.

Творы, у якіх сустракаюцца несіметрычныя памеры, трэба ўключаць у індывідуальныя планы студэнтаў. Глыбокае іх вывучэнне будзе садзейнічаць не толькі ўдасканаленню дырыжорскай тэхнікі, але мастацкаму выхаванню будучага дырыжора.

**Грабеннікаў Р.В.,**
*прафесар*

## РОЛЯ САЦЫЯЛАГІЧНЫХ ВЕДАЎ У ПРАЦЭСЕ РАЗВІЦЦЯ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ СТУДЭНТАЎ

Праблема здольнасцей чалавека пры вялікім дынамізме развіцця грамадства і адпаведна павышэнні патрабаванняў да асобы становіцца вельмі актуальнай. Гэта тлумачыцца тым, што ўкараненне ў матэрыяльную і духоўную вытворчасць дасягненняў сацыяльнага і навуковага прагрэсу дыктуе неабходнасць адпаведнага ўліку здольнасцей чалавека да таго альбо іншага віду дзейнасці ў складанай сістэме грамадскай вытворчасці.

Для работнікаў культуры праца па ўліку здольнасцей мае асаблівае значэнне, бо без іх нельга творча працаваць як у клубе, так і ў бібліятэцы, і тым больш кіраваць хорам або фальклорным калектывам. У паспяховым рашэнні гэтай творчай і вельмі складанай праблемы вялікую ролю маюць заняткі па сацыялогіі, якія выяўляюць, з аднаго боку, агульныя і прафесійныя здольнасці студэнтаў, а з другога — паглыбляюць іх развіццё. Аднак паспяховае рашэнне такой задачы звязана з выкананнем жорсткіх патрабаванняў: выкарыстанне ведаў па сацыялогіі нельга праводзіць фармальна, яно павінна быць творчым, г.зн. з абавязковым улікам асаблівасцей прафесійнай спецыялізацыі студэнтаў і іх агульнага развіцця. Такі падыход дыктуецца тым, што студэнту трэба творча ўспрымаць сацыялагічныя паняцці, як і паняцці іншых вучэбных дысцыплін. Важна, каб студэнты, тыя веды, што яны атрымоўваюць на занятках, самі перапрацоўвалі і прапускалі праз прызму сваіх прафесійных здольнасцей, развіваючы і ўзбагачаючы іх. Адсюль у кожнага вучня засваенне тэарэтычных ведаў (у першую чаргу катэгорый і законаў) павінна ісці не абстрактна, а праз яго асобыя здольнасці (агульныя і прафесійныя). Дзякуючы гэтаму дасягаецца двайны эфект: здольнасці студэнта атрымліваюць сацыялагічны імпульс сваіму развіццю, а сацыялагічны вучэбны матэры-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ